Салаўёў М.

# ГЕРОЙ З ВЁСКІ БОРКІ

Мікалай Карначонак праславіўся ў баях пад Сталінградам. Упершыню савецкія людзі пачулі яго імя ў лістападзе 1942 года, калі газета "Праўда" апублікавала Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні групе летчыкаў звання Героя Савецкага Саюза, а пра Мікалая напісана было: "Лётчык гвардзейскага авіяцыйнага палка Карначонак здабыў сабе вялікую славу пад Сталінградам. Смеласць і выключнае ўменне вызначаюць гэтага маладога 20-гадовага лётчыка. Ён ваюе з першых дзён Айчыннай вайны і зарэкамендаваў сябе добрым паветраным байцом. Яго самалёт 349 разоў узнімаўся ў паветра. У гарачых баях тав. Карначонак збіў асабіста 10 нямецкіх самалётаў, у тым ліку 7 бамбардзіроўшчыкаў".

Мікалай Карначонэк закончыў Старасельскую сямігадовую школу Шклоўскага раёна і працаваў на Аршанскім мясакамбінаце. Пасля заканчэння гарадскога аэраклуба ён атрымаў рэкамендацыю камсамольскай арганізацыі для паступлення ў ваеннае лётнае вучылішча, вучыўся ў Адэсе, потым служыў у авіяцыйных часцях. Вялікую Айчынную вайну сустрэў лётчыкам 433-га знішчальнага авіяцыйнага палка, якім камандаваў вядомы авіятар маёр І. І. Клешчаў.

...У цяжкія летнія дні сорак першага года ўступіў Мікалай Карначонак у бой з фашыстамі. У баях умацоўвалася і адточвалася майстэрства лётчыка, рос яго аўтарытэт. Мікалая паважалі таварышы, з ім раіліся. На яго рахунку было некалькі збітых самалётаў праціўніка, ён двойчы ўзнагароджваўся камандаваннем за захаванне матэрыяльнай часткі. Гэта значыць, што два разы пасля паветраных баёў Карначонак вяртаўся на свой аэрадром на пашкоджаным самалёце, які можна было, прытрымліваючыся інструкцыі, пакінуць, а самому выкінуцца з парашутам. Але лётчык добра ведаў, як патрэбна кожная баявая машына. І ён, выкарыстаўшы ўвесь свой вопыт і майстэрства, абодва разы ўдала прыводзіў самалёт і рабіў пасадку, каб праз дзень-два на адрамантаваным знішчальніку зноў падняцца ў паветра і ўступіць у бой з ворагам.

..У той дзень Карначонак вярнуўся на аэрадром пад вечар. Са штаба выйшаў камандзір палка маёр І. І. Клешчаў, і лейтэнант пайшоў яму насустрач:

– Таварыш маёр, заданне выканана. У баі збіў варожы бамбардзіроўшчык.

– Выдатна, лейтэнант, – сказаў Клешчаў. – Віншую з перамогай і ад імя камандавання ўручаю вам ордэн Чырвонага Сцяга! Упэўнены, што гэта не апошняя ваша ўзнагарода.

Радасна забілася сэрца лётчыка. Прымаючы ордэн з рук камандзіра, ён адказаў:

– Служу Савецкаму Саюзу!

Жорсткія баі штодня ўспыхвалі ў паветры. Палала зарыва вайны на зямлі. Пад націскам пераўзыходзячых сіл праціўніка нашы часці вымушаны былі адступаць. Восем знішчальнікаў пад камандаваннем капітана Ізбінскага прыкрывалі адзін з участкаў нашай абароны. Прайшлі над ракой раз-другі. Разварочваючы самалёт, Карначонак убачыў варожыя бамбардзіроўшчыкі.

Капітан Ізбінскі таксама заўважыў ворагаў. Бамбардзіроўшчыкаў было трыццаць. Іх прыкрывалі дзевяць знішчальнікаў. Але гэта не спалохала лётчыкаў Ізбінскага. Ён аддаў загад:

– Чацвёрка Карначонка звязвае боем знішчальнікаў, астатнія атакуюць бамбардзіроўшчыкаў.

Атака нашых знішчальнікаў была нечаканай. Тры бамбардзіроўшчыкі, пакідаючы дымныя сляды ў небе, паляцелі да зямлі, збітыя трапнымі чэргамі.

Пакуль варожыя лётчыкі не апамяталіся, капітан Ізбінскі павёў сваю чацвёрку ў атаку. Яна таксама аказалася паспяховай – былі збіты яшчэ два бамбардзіроўшчыкі. Уцалеўшыя кінуліся ў розныя бакі.

А ў гэты час чатыры нашы знішчальнікі вялі бой з "месершмітамі". Вытрымаўшы першую атаку, варожыя лётчыкі самі перайшлі да актыўных дзеянняў. Бой прыняў жорсткі характар. На выхадзе з атакі Карначонак убачыў, што адзін з ворагаў накіраваў свой самалёт прама на яго машыну. Лейтэнант пайшоў насустрач варожай машыне.

– У першае імгненне ў мяне паявілася жаданне звярнуць у бок, – расказваў пасля бою Мікалай таварышам. – Але я моцна сціснуў штурвал і ішоў прама на ворага. Той не вытрымаў, рвануў свой самалёт уверх. Вось тут я і даў па ім чаргу.

Той бой завяршыўся перамогай. Усе нашы самалёты вярнуліся на свой аэрадром, збіўшы пяць варожых бамбардзіроўшчыкаў і два знішчальнікі. Баявы рахунак Мікалая Карначонка папоўніўся яшчэ двума збітымі самалётамі.

Ішоў верасень сорак другога года. Лётчыкі палка маёра Клешчава ўзляталі з палявога аэрадрома паблізу Сталінграда, патрулявалі над горадам. У адзін з такіх дзён эскадрылля капітана Ізбінскага вылятала на перахоп самалётаў праціўніка. Сустрэлі іх нашы знішчальнікі на падыходзе да Сталінграда. У першай жа атацы збілі два. Мікалай Карначонак атакаваў варожы бамбардзіроўшчык, але і сам быў атакаваны знішчальнікам ворага.

– Трымайся, Коля! – пачуў ён голас баявога сябра Уладзіміра Мікаяна.

Адразу трапная чарга прашыла самалёт ворага, і той зваліўся на зямлю.

Самалёты закруціліся ў смяротнай каруселі. Карначонак змагаўся смела і знаходліва – яго баявы рахунак павялічыўся яшчэ на адзін збіты самалёт.

21 верасня маёр Клешчаў вярнуўся са штаба дывізіі. Сабраўшы лётчыкаў, ён сказаў:

– Нашы войскі пачынаюць наступленне. Заўтра раніцай наш полк вылятае на прыкрыцце наступаючых на станцыю Катлубань.

Час блізіўся да поўдня, калі эскадрылля Ізбінскага ў чацвёрты раз узнялася ў паветра. Каля сарака самалётаў сышліся ў баі – лётчыкі эскадрыллі перахапілі варожыя бамбардзіроўшчыкі. Бой быў непрацяглым, але гарачым. Фашысты пры першай жэ атацы нашых лётчыкаў сталі скідваць бомбы на пазіцыі сваіх войск, выходзіць з бою. Мікалай Карначонак, Міхаіл Гарам і Герой Савецкага Саюза Шышкін збілі па аднаму самалёту ворага.

Лётчыкі эскадрыллі кінуліся ў пагоню за нямецкімі бамбардзіроўшчыкамі. Наперадзе ўсіх была машына старшага лейтэнанта Карначонка (яму гэтае воінскае званне было прысвоена за некалькі дзён да бою). Ім валодала адно жаданне – дагнаць ворага, знішчыць яго. З гэтай думкай ён уступіў у бой з некалькімі самалётамі гітлераўцаў. З гэтай думкай загінуў у смяротнай сутычцы.

...Прайшлі гады. Не забыты подзвіг героя. Працаўнікі Магілёўскага авіяпрадпрыемства навечна залічылі ў састаў брыгады Героя Савецкага Саюза М. А. Карначонка. Вялікую пошукавую работу правялі вучні Старасельскай сярэдняй школы пад кіраўніцтвам педагога Івана Андрэевіча Майсеева.

Сабраныя матэрыялы і дакументы школьнікі беражліва захоўваюць у сваім гісторыка-краязнаўчым музеі. Гэтыя дакументы расказваюць не толькі пра Мікалая Аляксандразіча Карначонка. Тут ёсць звесткі пра камісара партызанскай брыгады "Чэкіст" Фёдара Міхайлавіча Сядлецкага, вядомых людзей суседніх вёсак, матэрыялы аб родным краі, яго прыродзе, дакументы і ўспаміны аб баявых подзвігах землякоў.

**Салаўёў, М. Герой з вёскі Боркі / М. Салаўёў // Настаўніцкая газета. — 1982. — 8 снежня. — С. 4.**